# УВОДЗІНЫ

Навучыць дзяцей правільнаму, бегламу, усвядомленаму, выразнаму чытанню — адна з галоўных задач пачатковай адукацыі. Але ў апошні час усё больш бацькоў сутыкаюцца з тым, што іх дзеці чытаюць вельмі марудна. А менавіта ад гэтага важнага комплекснага навыку залежаць іх поспехі ў навучанні. Як дапамагчы дзецям? Для павелічэння хуткасці чытання існуе шмат эфектыўных і цікавых прыёмаў.

Вашай увазе прадстаўлена выданне, якое змяшчае не толькі творы для пазакласнага чытання, рэкамендаваныя праграмай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, але і эфектыўныя практыкаванні, накіраваныя на павелічэнне хуткасці чытання, на развіццё ўсвядомленасці, увагі і памяці, чытацкай самастойнасці.

Матэрыял складаецца з 9 раздзелаў, прысвечаных асобнай тэме, яго можна выкарыстоўваць на ўроках пазакласнага чытання для арганізацыі індывідуальнай, парнай, групавой або франтальнай работы з навучэнцамі. Яго могуць паспяхова ўжываць бацькі чацвёртакласнікаў для заняткаў з дзецьмі дома. Праца з выданнем зробіць навучанне хуткаму чытанню цікавым і займальным.

Практыкаванні, якія спрыяюць фарміраванню навыку хуткага чытання ў малодшых школьнікаў:

| **Практыкаванне** | **Каштоўнасць** |
|---|---|
| 1. «Тэкст без прабелаў» | Развіццё інтэлекту, логікі, памяці, хуткасці разумення і аналізу тэксту. |
| 2. «Зашумлены тэкст» | Замацаванне ў памяці цэласных глядзельных вобразаў літар і іх спалучэнняў.<br>Развівае і ўдасканальвае другасную зону патылічнай кары левага паўшар'я. |
| 3. «Схаваная частка радка» | Фарміраванне славесна-лагічнай памяці, асабліва яе аб'ёму. Развіццё антыцыпацыі: адгадванне слоў па літарах з адсутнымі элементамі.<br>Спрыяе разуменню не толькі таго, якая літара схаваная, але і слова цалкам, а галоўнае — дазваляе зразумець сэнс і сказа, і ўсяго прапанаванага тэксту ў ходзе чытання. |
| 4. «Пераблытаныя словы» | Фарміраванне ўмення спалучаць у працэсе чытання арыентоўку і на літаральны аналіз слоў, разуменне сэнсу апісанай сітуацыі. |
| 5. «Камбінаванне» | Замацаванне набытых навыкаў.<br>Накіравана на паляпшэнне канцэнтрацыі ўвагі, памяці, кемлівасці; развіццё здольнасці вылучаць патрэбную інфармацыю, перцэпцыйных і моварухальнай сістэм працаваць пры адначасовым функцыянаванні двух супрацьлеглых напрамкаў; фарміраванне напрамку на тое, што звычайнае чытанне — параўнальна нескладаная, пасільная справа. |

| Практыкаванне | Каштоўнасць |
|---|---|
| 6. «Праз слова» | Выпрацаванне навыку сэнсавай здагадкі: фарміраванне сказаў па дадзенных словах.<br>Уносіць разнастайнасць, ажыўленне ў працэс чытання, стварае ў чытача адчуванне павелічэння хуткасці чытання. |
| 7. «Тэкст-спіраль» | Фарміраванне навыку апярэджвання тэксту.<br>Робіць чытанне яшчэ больш усвядомленым, цікавым і вясёлым. |
| 8. «Тэкст-пункцір» | Замацаванне ў памяці цэласных глядзельных вобразаў літар і іх спалучэнняў.<br>Развівае і ўдасканальвае другасную зону патылічнай кары левага паўшар'я. |
| 9. «Рукапісны тэкст» | Дапамагае развіваць навыкі асэнсаванага чытання і правапісу. |

**Асноўнае прызначэнне гэтых практыкаванняў — навучыць пры чытанні:**

- бачыць усё слова або сказ цалкам;
- пашырыць перыферычнае поле зроку;
- навучыць чытаць тэкст «пра сябе»;
- развіваць увагу і памяць.

**Кожныя 15 хвілін неабходна выконваць гімнастыку для вачэй:**

1) кругавыя кручэнні вачыма, не закрываючы іх, па 4 разы спачатку ў адзін бок, потым — у другі;

2) злёгку націскаць на закрытыя вочы;

3) зафіксаваць погляд на кончыку пальца, набліжаць палец да носа і аддаляць на адлегласць выцягнутай рукі, утрымліваючы погляд на пальцы.

Да кожнага тэксту даецца пытанне для праверкі ўсвядомленасці чытання ці практычнае заданне, накіраванае на замацаванне набытых навыкаў, на паляпшэнне канцэнтрацыі ўвагі, памяці, кемлівасці, здольнасці вылучаць патрэбную інфармацыю, даказваць свой пункт гледжання, што падымае настрой і стварае станоўчую матывацыю да чытання.

# ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА

Практыкаванне № 1 **«Тэкст без прабелаў».** Чытай тэксты, адзначаючы пра сябе канец слова, канец сказа, канец думкі.

## КАЛЯ РЭЧКІ

*(Урывак з вершаванай казкі «Рак-вусач»)*

**1**

Нужіслаўнакалярэчкі!
Ічагонаёйняма!
Сітнякістаяць,бысвечкі,
Тутмалінаіпарэчкі—
Розныхягадпростацьма;
Тутілозы,іракіты,
Ічарот,іасака,—
Ну,яктыяаксаміты,
Вабяцьвокарыбака.
Атыхптушакінезлічыш:
Качкі,кнігаўкі,драчы,
Ісамбусел-паляўнічы
Васугосцітутзакліча,
Жабуўдзюбенесучы.
Тутжывезванар-камар,
Якбалотныгаспадар,



**2**

Даўганосы,даўганогі,
Голастонкі,асамстрогі.
Утравеміжчаратоў—
Колькірозныхматылёў,
Бабаксініхічырвоных:
Іхсукеначкіўфальбонах,
Іхубор—ідуўзаклад—
Закасуеўсіхдзяўчат.
Веселанарэчцы
Ітраве,ікветцы,
Ікрылатымпташкам,
Мошкамімурашкам,
Ікрыклівымдзеткам,
Асаблівалеткам:
Урачулцыкупаюцца,
Улясочкукачаюцца.

*(Я. Колас)* [5]

*Аксамі́т* — шаўковая тканіна з кароткім густым ворсам.
*Сітня́к* — травяністая расліна сямейства асаковых, якая расце на берагах ракі, па сырых, балоцістых месцах.
*Фальбо́на* — палоска матэрыялу, прышытая зборкамі да спадніцы, фартуха і пад.
*Чаро́т* — высокая травяністая расліна сямейства асаковых, якая расце ў вадзе рэк, азёр, на балотах.

Якой паўстала перад табой рака ў апісанні паэта? Падкрэслі ў тэксце тыя словы і сказы, якія дапамаглі табе яе ўявіць.

Практыкаванне № 3 **«Схаваная частка радка».** Чытай тэксты як звычайна, некаторыя радкі чытай па верхняй ці ніжняй частках літар.

## РАДЗІМА

Хата між клёнаў.

Сад за сцяной.

Коўдрай зялёнай

Луг за ракой.

Зводдаля — жыта,

За жытам — хмызняк.

Проста нібыта,

Ды люба усё як!

*(М. Пазнякоў)* [7]

Складзі сінквейн «Радзіма» да верша.

# ЧАЛАВЕК, СЛОВА І КНІГА

Практыкаванне № 4 **«Пераблытаныя словы».** Чытай тэксты, а ў выдзеленых радках знайдзі кожнаму слову месца ў сказе.



## Скарына

Асветнік, вучоны і першадрукар,
Наш гонар – Францішак Скарына.
**ўсім Запомні сэрцам**
Як велічны дар Радзімы Славутага сына.
**дарогу Святла, ён Праклаў Слова, да**
За Матчыну Мову паклікаў змагацца,
**заўсёды між вольных вольнай магла Каб**
Дзяржаваю Белая Русь называцца.

*(М. Пазнякоў)* [7]

Адзнач на палях асноўную думку верша. Растлумач свой выбар.

# БЫЦЬ НА ЗЯМЛІ ЧАЛАВЕКАМ

☞ Практыкаванне № 6 **«Праз слова».** Чытай тэксты праз слова, здагадваючыся пра сэнс сказа па дадзеных словах.

## ЦУКЕРКІ

У маленстве занадта хацелася цукерак. Пэўна, таму, што крамы ў нашай вёсачцы не было, ды і сям'я была вялікая — шасцёра малых. Маці даводзілася пазычаць грошы нават на хлеб. Час быў нялёгкі: у канцы пяцідзясятых гадоў краіна яшчэ залечвала цяжкія ваенныя раны.

Увосень я павінен быў пайсці ў другі клас. Патрэбна было купляць падручнікі, і мы з сябрам сабраліся ў суседнюю вёску, куды аўталаўка з райцэнтра падвозіла іх на продаж. Маці дала мне дзесяць рублёў, якіх якраз павінна было хапіць на кнігі. Грошы яна паклала мне ў левую кішэньку пінжака, дастала з шафы новую хустку, каб я звязаў акуратна кнігі і не забрудзіў іх па дарозе.

— Мамачка, дай на цукеркі, — стаў прасіць я.

Мне дапамагалі малодшыя брат і сястра. Маці пагледзела на майго аднакласніка Лёшку, які сціскаў у кулаку некалькі карамеляў і дзве трымаў у роце, і паклала мне ў правую кішэньку рубель.

З хаты я выходзіў самым шчаслівым.

— Глядзі, Міхасік, не пераблытай грошы, — папярэдзіла маці.

— Дзясятка — на кнігі, рубель — на цукеркі.

Да суседняй вёскі было тры кіламетры. Па дарозе Лёшка пачаставаў мяне цукеркай. Смачная-смачная, яна хутка растала ў роце. Як толькі мы выйшлі за вёску, я працягнуў сябру рубель і папрасіў прадаць мне цукерак. Лёшка, нібы чакаў гэтага, дастаў з кішэняў дванаццаць карамеляў. Восем я адлічыў, каб прынесці дадому, адну разгарнуў і паклаў у рот. Пакуль мы дайшлі да школы, у мяне засталося толькі шэсць цукерак. Я нічога не мог зрабіць, бо з кожнай хвілінай цукерак мне хацелася ўсё больш.

Падручнікаў не было. Аўталаўка з райцэнтра не прыязджала, і мы вырашылі пачакаць гадзіну. Хадзілі па



Трэцяя груша была як садовая. Мо бэра, мо вішнёўка. — А цяпер во гэты яблычак… — падала мне бабуля валікі, з курынае яйка, яблык. — Штрыфель?! — пазнаў я па смаку. — Але пахне незвычайна, як мёдам. На дзічку і не падобны. — А гэта і не дзічка. Быў такі чалавек у нашым сяле — Захарка. Калаў у лесе дзічкі, у садзе пераносіў, прышчэпліваў. Вельмі смачныя яблыкі, калі прышчэпліваць да лясных. А потым стаў па лесе хадзіць, дзе маладзенькую грушу ці яблыньку сустрэне — зрэжа, прышчэпіць. Дзе старэйшую — то галінку ці дзве прышчэпіць. Знойдзеш цяпер такое дрэўца — як падарунак да свята. — Помнік чалавек сабе зрабіў… — кажу я. — Але каторы год, як яго няма, а людзі ўсё дзякуюць чалавеку. Дабро — яно жывучае. — А цяпер паглядзі назад! Я азірнуўся. На паляну схілілася Захаркава яблыня. Дзве галіны на ёй былі незвычайныя — на адной яблыкі былі белыя, як папера, на другой — жоўта-аранжавыя, сплюшчаныя, як рэпкі. Мы падышлі бліжэй. — Як сонца… Налілася проста… Залаты ранет, — сказала бабка Вера. Твар яе свяціўся, нібы не Захарка, а яна стварыла гэты цуд.

*(П. Місько)* [6]

Што значыць для цябе «быць добрым чалавекам»?

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

**1.** *Бяганская, Я.* Сланечнікі : апавяданні : [для малодшага школьнага ўзросту] / Я. Бяганская. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1980.

**2.** *Бядуля, З.* Дзень добры! : вершы, казкі, апавяданні : [для дашкольнага ўзросту] / З. Бядуля. — Мінск : Юнацтва, 1989. — 88 с.

**3.** *Вітка В.* Казкі / В. Вітка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1976.

**4.** *Вітка, В.* Случчына : вершы, паэмы, казкі / В. Вітка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1981.

**5.** *Колас, Я.* Збор твораў : у 20 т. / Якуб Колас. Т. 4 : [Вершы, 1946—1956 ; Апавяданні вершам, 1907—1929, 1938 ; Вершаваныя казкі, 1917, 1926, 1929, 1956 ; Паэма ”Міхасёвы прыгоды“, 1933, 1935 ; У сааўтарстве, 1936—1949 / рэд. тома М. А. Тычына. — Мінск : Беларуская навука, 2008.

**6.** Літаратурнае чытанне: падручнік для 3-га кл. агульнаадукац. устаноў з рус. мовай навучання / В. С. Варапаева, Т. С. Куцанава. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. — 128 с.

**7.** *Пазнякоў, М.* Ехаў поўны воз дзівос : вершы, смяшынкі, лічылкі, небыліцы, скорагаворкі, загадкі : для мал. шк. узросту / М. Пазнякоў. — Мінск : Юнацтва, 1994.

**8.** *Пазнякоў, М.* Сынок. Апавяданні і казкі / М. Пазнякоў ; мастак П. Дубановіч. — Мінск : Беларусь, 2021. — 143 с.

**9.** *Пазнякоў, М.* Тры чарадзеі : вершы, скорагаворкі, загадкі : [для дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту] / М. Пазнякоў. — Мінск : Юнацтва, 1991. — 112 с.

**10.** Пралеска. Хрэстаматыя для дзіцячага сада і пачатк. шк. / уклад., уступ. арт. А. І. Сачанкі. — Мінск : Скакун, 1997.

**11.** *Рунец, П.* Ніколі не забудзем / П. Рунец. — Мінск : Юнацтва, 1989.

**12.** *Танк, М.* Збор твораў : у 13 т. / М. Танк. Т. 1 : Вершы (1930—1939) / [рэдактар тома А. Л. Верабей. — Мінск : Беларуская навука, 2006.

**13.** *Шамякін, І. П.* Промні маленства [Тэкст] : апавяданні / І. П. Шамякін. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2002.

---

# ЗМЕСТ

*Уводзіны* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1

**ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

**Практыкаванне № 1 «Тэкст без прабелаў»**

Каля рэчкі *(Я. Колас)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Воўк *(І. Шамякін)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

**ЧАЛАВЕК І ЯГО РОД** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6

**Практыкаванне № 2 «Зашумлены тэкст»**

Вавёрчына гора *(В. Вітка)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 6

**ЧАЛАВЕК І РАДЗІМА** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

**Практыкаванне № 3 «Схаваная частка радка»**

Радзіма *(М. Пазнякоў)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 11

Заўжды вярнуся *(М. Пазнякоў)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 12

Адказ сыну *(М. Пазнякоў)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13

**ЧАЛАВЕК, СЛОВА І КНІГА** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14

**Практыкаванне № 4 «Пераблытаныя словы»**

Скарына *(М. Пазнякоў)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 14

Слова *(В. Вітка)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 15

**ЧАЛАВЕК І МАСТАЦТВА** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16

**Практыкаванне № 5 «Камбінаванне»**

Дудачка *(З. Бядуля)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16

Казка пра Музыку *(М. Танк)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 17

**БЫЦЬ НА ЗЯМЛІ ЧАЛАВЕКАМ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

**Практыкаванне № 6 «Праз слова»**

Цукеркі *(М. Пазнякоў)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27

Антося *(Я. Бяганская)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 29

**ЧАЛАВЕК І ГРАМАДСТВА** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31

**Практыкаванне № 7 «Тэкст-спіраль»**

Добры чалавек *(П. Місько)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31

**ЧАЛАВЕК НА ПЛАНЕЦЕ ЗЯМЛЯ** . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

**Практыкаванне № 8 «Тэкст-пункцір»**

Васілёва бярозка *(М. Гамолка)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . 33

**ЛЁС ЧАЛАВЕКА НА ВАЙНЕ** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 35

**Практыкаванне № 9 «Рукапісны тэкст»**

Буду памятаць *(апавяданне з кнігі «Ніколі не забудзем»)* . . . 35

ЛІТАРАТУРНЫЯ ЗДОЛЬНАСЦІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

*Спіс выкарыстаных крыніц* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 38